Дабрачынная дзейнасць садалісӑў, безумоўна, садзейнічала выхаванню ў іх найлепшых маральных якасцей: міласэрнасці, спагадлівасці, самаахвярнасці, набожнасці.

Задачы сацыялізацыі навучэнцаў таксама вырашаліся праз вучнёўскае самакіраванне, якое называлася магістратам. У кола абавязкаў магістрата ўваходзілі разгляд канфліктаў, сварак, прызначэнне нязначных пакаранняў, улік наведвання заняткаў вучнямі, кантроль дысцыпліны на іх [2, с. 55].

Праз самакіраванне вучні арыентаваліся на фарміраванне і развіццё звычкі культурных паводзін, асваенне новых сацыяльных роляў, выпрацоўку грамадзянскай пазіцыі і каштоўнасных адносін да саміх сябе і іншых людзей. На падставе ўсяго гэтага ў іх развіваліся навыкі самастойнага прыняцця рашэнняў, папярэджваліся антыграмадскія паводзіны. Такім чынам вучні рыхтаваліся да прафесійнай дзейнасці і адаптаваліся да жыцця за межамі сваіх навучальных устаноў.

Езуіты былі першымі, хто ў сваіх навучальных установах увёў спартыўныя мерапрыемствы, дзеля чаго выдзяляўся адзін свабодны ад класных заняткаў дзень у тыдзень. У гэты дзень вучні займаліся фехтаваннем, коннай яздой, разнастайнымі каманднымі гульнямі на спартыўнай пляцоўцы, гулялі на лугах і палянах. Акрамя аднаўлення фізічных сіл і фарміравання камфортнага псіхалагічнага стану спартыўныя заняткі садзейнічалі з'яўленню пачуцця ўзаемападтрымкі, прыналежнасці да калектыву, усведамлення яго каштоўнасці ў асабістым і сацыяльным жыцці.

Увогуле можна сцвярджаць, што сацыяльнае выхаванне ў езуіцкіх калегіумах характарызавалася шырокім выкарыстаннем разнастайных форм і метадаў, якія не страцілі сваёй актуальнасці і могуць быць запатрабаваны сучаснай сістэмай адукацыі вучнёўскай і студэнцкай моладзі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Туровец, В. С. Социальное воспитание в коллегиумах Ордена иезуитов / В. Туровец // Теоретические и практические аспекты развития современной науки: теория, методология, практика : сб. ст. по материалам Междунар. науч.-практ. конф., Уфа, 3 июня 2019 г. : в 3 ч. – Уфа : Изд. НИЦ Вестник науки, 2019. – Ч. 3. – С. 100–104.

2. The Jesuit Ratio Studiorum of 1599 / Translated by A. Farrel. – Washington : D.C. Conference of Major Superiors of Jesuits, 1970. – 133 p.

**З. М. Заіка**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

## ПЫТАННІ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ І ЎЖЫВАННЯ ТЭРМІНАЛАГІЧНАЙ ЛЕКСІКІ СТУДЭНТАМІ ЭКАНАМІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

Пытанні фарміравання і ўкладання слоўніка бухгалтарскага ўліку выяўляюцца толькі пры функцыянаванні тэрмінаў у кантэксце. Разыходжанні ў інтэрпрэтацыі тэрмінаў часта абумоўлены як зменлівым характарам

экстралінгвістычных умоў прафесійнай дзейнасці спецыялістаў і іх камунікацыяй, так і пэўнымі асаблівасцямі традыцый ужывання спецыяльнай лексікі. Не заўсёды можна назіраць аднолькавы аб'ём зместу паняцця ва ўсіх камунікантаў. Таму пэўная акрэсленасць паняцця з'яўляецца неабходнай падставай пры ўкладанні слоўніка спецыяльнай лексікі, тэарэтычных і прыкладных дысцыплін эканаміста.

З гэтай мэтай да заліку ў І семестры студэнтам эканамічных спецыяльнасцей мы ставім абавязковай умовай стварэнне тэрміналагічных слоўнікаў (з улікам словаўтваральнай парадыгмы) па эканамічных спецыяльнасцях. Апорная лексіка ўкладаецца ў межах тэмы іх курсавой працы.

Кагнітыўны аспект эканамічнай тэрміналогіі ўяўляе сабою асаблівасці развіцця сістэмы спецыяльных бухгалтарскіх ведаў, што фарміруюцца працяглы час пад уздзеяннем унутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных фактараў.

Важнай сістэмнай прыкметай тэрміналогіі з'яўляецца структурыраванасць міжтэрміналагічных парадыгматычных сувязяў, што знаходзіць увасабленне ва ўладкаванні ланцужкоў тэрміналагічных адзінак, якія суадносяцца з паняційнай сістэмнасцю ўнутры данай сферы. У сувязі з гэтым узнікла паняцце тэрмінасістэмы, якое адрозніваецца ад паняцця тэрміналогіі, што абазначае сукупнасць тэрмінаў.

Для актывізацыі слоўніка спецыяліста ў сферы прафесійных зносін намі адзначаны для выканання студэнтамі ў першую чаргу такі від практыкаванняў, як адбор і ўжыванне тэрмінаў, што суадносяцца з пэўнай тэрмінасістэмай. Актуалізацыя іх можа адбывацца толькі на ўзроўні парадыгматыкі [1, с. 43].

У тэрміналагічнай лексіцы па спецыяльнасці бухгалтарскага ўліку вылучаюцца тэматычныя сегменты, што суадносяцца па многіх прыкметах з тэматычнымі групамі іншых прадметных абласцей эканамічнай навукі, напрыклад: а) бухгалтарскія балансы (балансы інвентарныя, ліквідацыйныя, генеральныя і інш.); б) бухгалтарскія аперацыі па ўліку маёмасці (амартызацыя, спісанне, акцэпт і г. д.) і інш.

Пры фарміраванні і актуалізацыі спецыяльнай лексікі па бухгалтарскаму ўліку, улічваючы яе парадыгму, мы прапаноўваем студэнтам практыкаванні на вызначэнне прадуктыўных спосабаў тэрміналагічнай дэрывацыі: а) афіксацыя (крэдыт, крэдытаванне, крэдытаздольнасць і г. д.); б) метафарызацыя (напрыклад, замарожаны лік, лізінг і г. д.); в) сінтаксічная тэрмінадэрывацыя (напрыклад, актывы фінансавыя, актывы ліквідныя і г. д.).

У сучаснай навуцы існуе працэс дынамікі з розных стылёвых сфер, які ідзе ў напрамку ад бытавой мовы да тэрміналогіі (тэрміналагізацыя) і наадварот (дэтэрміналагізацыя). Галіновая тэрміналогія па сваёй структуры часткова супадае з агульнанавуковай тэрміналогіяй і нават з агульнаўжывальнай лексікай. Шляхам метафарычнага ўжывання дэтэрміналагізаваныя тэрміны пэўных тэматычных груп па спецыяльнасці бухгалтарскага ўліку пераходзяць у сферу агульнаўжывальнай лексікі: баланс (бухгалтарскі тэрмін) і баланс (агульнаўжывальнае слова) і інш.

Для замацавання значэнняў тэрмінаў будзе карысным практыкаванне па стварэнні і вызначэнні такіх лексічных адносін у тэрмінасістэме, як

сінанімічныя, антанімічныя і аманімічныя. Безумоўна, для тэрміналагіч сістэмы яны вельмі спецыфічныя. Найчасцей сустракаюцца такія тэрмі сінонімы, якія вылучаюцца з дзвюх іншамоўных тэрмінасістэм, напрык кантралёр – рэвізор, спонсар – фундатар. Радзей вылучаецца іншамоўны тэр і ўласнабеларускі: экспарт – бартар – тавараразварот. Неабходна звярнуць ув што сінонімы пры гэтым адрозніваюцца сваёй экспрэсіўнай афарбоў замацаванасцю за пэўным стылем, ступенню ўжывальнасці (спонсар – мецэна

Важна адзначыць асобную групу сінонімаў, што складаюць тэрмі дублеты, – словы, якія не маюць ні семантычных, ні стылістычных адрозненн

Акрамя таго, у тэрміналагічнай лексіцы, як і ў агульнаўжывалы выдзяляюцца тэрміналагічныя варыянты. Як лічаць многія лінгвісты, узнікненне і існаванне выкліканы недасканалай распрацаванасцю тэрміналогі

З'ява антаніміі праяўляецца ў тым выпадку, калі словы асацыірую з іншымі словамі па прынцыпе кантрасту: увоз – вываз; або дзякуючы розн лексемам з супрацьлеглым значэннем.

Такім чынам, пры ўкладанні студэнтамі тэрміналагічнага слоўн падмовы сваёй спецыяльнасці, напрыклад падмовы бухгалтарскага ўліку, мо вызначацца пэўны моўны спецыяльны ланцужок закрытага тыпу з вялі колькасцю парадыгматычных і стылістычных фармулёвак.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Вербицкий, А. А. Активное обучение в высшей школе / А. А. Вербицки М. : Высш. шк., 1991. – 207 с.

**Т. М. Ігнацюк**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

## АСНОЎНЫЯ КАНСТЫТУТЫЎНЫЯ ПРЫКМЕТЫ ПАФАСУ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ

Аналіз літаратуры, у якой так ці інакш закранаецца катэгорыя пафа дазваляе вылучыць асноўныя, на нашу думку, канстытутыўныя прыкметы гэт складніка маўлення.

1. *Дыскурсіўнасць.* Пафас – катэгорыя дыскурсіўная. Сацыяльнае адзінст ўзнікае на аснове прыхільнасці ідэям, вобразам, эмоцыям, якія паяўляюцца п іх *артыкуляцыі.* Дыскурс з'яўляецца мнагазначным тэрмінам шыр гуманітарных навук, прадмет якіх прама ці ўскосна прадугледжвае вывучэн функцыянавання мовы – лінгвістыкі, літаратуразнаўства, сацыялогіі, філасоф інш. Выразнага і агульнапрызнанага вызначэння дыскурсу, якое б ахоплівала ; выпадкі яго ўжывання, не існуе, і не выключана, што менавіта гэта спрыя шырокай папулярнасці, набытай гэтым тэрмінам за апошнія дзесяцігоддзі.

Найбольш зразумелым з'яўляецца камунікатыўная трактоўка дыскурсу маўлення і супрацьпастаўленне яго логасу – слову. Пад дыскурсіўнасцю шырокім сэнсе разумеецца ўласцівасць маўлення, супрацьпастаўлен